# Я – "АРОЛ", АДКАЗВАЙ!..

**КАРАСЁЎ Іван Раманавіч**

**Нарадзіўся ў 1920 годзе ў вёсцы Вілейка Чавускага раёна ў сям’і селяніна-бедняка. Закончыў сем класаў. Да прызыву ў Савецкую Армію працаваў у калгасе.**

**Званне Героя Савецкага Саюза сержанту Івану Раманавічу Карасёву прысвоена Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 29 кастрычніка 1943 года.**

**Памёр у 1955 годзе.**

Горача. У ценю дамоў і дрэў групы людзей. Моладзь, старыя, жанчыны. Адны плачуць, другія гавораць, гавораць збіўліва, праглынаючы словы, нібы баяцца, што не паспеюць сказаць усяго, што не было сказана раней, у мірную пару жыцця.

– У калону па чатыры ста-а-навіся!

На сярэдзіне вуліцы перад райваенкаматам стаяў у выцвілай ад сонца і поту гімнасцёрцы пяхотны капітан. Да яго кінуўся натоўп дапрызыўнікаў.

– Ну, мне пара, – прамовіў Іван, закідваючы за плечы невялікі мяшок, куды клапатлівыя рукі маці ўклалі змену бялізны, рушнік, конаўку і лыжку, каравай хлеба, смажаную і вараную ежу...

Задрыжаў, зморшчыўся, нібы ад зубнога болю, твар маці. Бацька выцягнуў кісет і пачаў згортваць "козью ножку". Прыкметна дрыжалі яго натружаныя, мазолістыя рукі.

– Ой, горушка наша... І адкуль, супастат на нашу галаву зваліўся, – загаласіла маці і, абхапіўшы шыю сына, амаль павісла на ім.

– Даволі, маці, – цвёрда сказаў бацька і з сілай адарваў яе ад сына. Прыціснуўся сваёй няголенай шчакой да шчакі Івана і таропка пачаў даваць яму, здавалася, самыя важныя і патрэбныя ў гэты час развітальныя настаўленні:

– Трымайся камандзіраў... Дрэннаму не навучаць... Выконвай загады... Германца разаб’ём. Будзь упэўнены... Не бываць Расіі пад чужым ботам. Гэта заўсёды памятай... Мужнасці і смеласці надае... Ідзі...

Стары Карасёў адштурхнуў ад сябе сына і, спахапіўшыся, ужо услед яму пракрычаў:

– Галоўнае: розуму не губляй. Чалавек, які разгубіўся на вайне, – гэта загінуўшы чалавек...

Прыстроіўшыся ў хвост калоны, Іван не-не ды і аглядваўся назад. Вось за ўзгоркам схаваліся Чавусы. Былі відаць толькі вярхушкі векавых ліп гарадскога парку. Зніклі і яны. У думках раптам узнікла родная вёска Вілейка. Школа, дзе ён вучыўся. Клуб, дзе было праведзена шмат вясёлых і цікавых вечароў, прачынаа кніг, убачана захапляючых кінафільмаў. Успомніліся сябры, вясковыя дзяўчаты. Сяброў у вёсцы ўжо няма. Дзе яны? На якіх франтах? У калгасе

засталіся старыя, жанчыны, дзеці. Цяжка ім будзе. Яшчэ не ўсё падрыхтавана да ўборкі...

З боку Магілёва і Чавус дакаціўся гул артылерыйскай кананады. Уздрыгнуў Іван. Збіўся з нагі нават. Акінуў позіркам маўкліва крочыўшых таварышаў: заўважылі? Здаецца не заўважылі. І, быццам наяву, пачуў апошнія словы бацькі:

– Галоўнае: розуму не губляй. Чалавек, які разгубіўся на вайне, – гэта загінуўшы чалавек.

Наказ бацькі, умудронага вопытам дзвюх войнаў, глыбока запаў у розум і сэрцэ маладога байца – сувязіста 1318-га стралковага палка 163-й стралковай дывізіі. Ён заўсёды перасцерагаў ад ракавой памылкі, прымушаў цвяроза ацэньваць techнаxа... 

…163-я стралковая дывізія ў саставе Паўночна-Заходняга фронту вяла ўпартыя наступальныя баі супраць Дзям'янскай групоўкі праціўніка. Полк, дзе служыў Іван Раманавіч, наступаў на станцыю Лычкова.

– "Ружа!" "Ружа!" Я – "Арол", я – "Арол". Адказвай! – манатонна бубніў у тэлефонную трубку Карасёў.

– Зноў абрыў, – ускочыў за маленькім столікам начальнік штаба палка. Ударыўся галавой аб столь бліндажа, зробленую з бярвення. Са злосці чартыхнуўся і, паўсагнуўшыся, выбег у траншэю, якая злучала бліндаж з зямлянкай, дзе размяшчаліся сувязныя батальёнаў і рот. Праз мінуту вярнуўся.

– Нікога...

– Дазвольце ісці? – Карасёў стаяў перад капітанам. За плячамі у яго віселі шпуля з тэлефонным кабелем і апарат палявога тэлефона. Рукі цвёрда сціскалі аўтамат.

– Ідзі, – дазволіў начальнік штаба – Будзь асцярожны. Сувязь патрэбна да зарэзу. Разумееш?

– Ясна, таварыш капітан. Сувязь будзе!

Калацілася, быццам у ліхаманцы, зямля. Не выпускаючы з рук тэлефоннага кабелю, Карасёў хутка прасоўваўся ўперад. Бег, падаў, поўз. Зноў уставаў і падаў пад блізкімі разрывамі снарадаў і мін. Раптам уперадзе, ад куста да куста, мільганулі дзве постаці фашысцкіх салдат.

– У нашы тылы прабраліся, – апякла мозг сувязіста страшная думка.

Рашэнне прыйшло імгненна: знішчыць. Зарываючыся ў снег, Карасёў папоўз да кустоў, за якімі схаваліся гітлераўцы. Асцярожна ўзняў галаву. Вось вы дзе! Аб чым гэта раіцеся?

– Хэндэ хох!

Сваю каманду сувязіст падмацаваў доўгай чаргой з аўтамата. Ад нечаканасці немцы сунуліся насамі ў снег. Новая аўтаматная чарга і грозны вокліч прымусілі гітлераўцаў ускочыць на ногі.

– Гітлер капут! Гітлер капут!.. – стукаючы зубамі, лапаталі няўдалыя ваякі.

А Карасёў пакутліва думаў, што зрабіць далей. Весці палонных у штаб – не будзе адноўлена сувязь...

– Форвертс! Шнэль, шнэль... (Уперад! Хутчэй, хутчэй...) – загадаў Карасёў фашысцкім салдатам, аўтаматам паказваючы напрамак руху.

Так і вёў ён сваіх палонных уздоўж лініі сувязі, нагрузіўшы шпуляй з кабелем. Яны ж зрошчвалі абрывы. Адно, два падключэнні, і, нарэшце, Іван пачуу знаёмыя пазыўныя штаба палка і другога батальёна.

...Верасень 1943 года. 163-я стралковая дывізія з баямі выйшла да Дняпра. У палках, батальёнах і ротах разгарнулася падрыхтоўка да яго фарсіравання. Праводзіліся сходы камуністаў і камсамольцаў. Падбіраліся добраахвотнікі для захопу плацдарма на правым беразе. У першую ўдарную групу фарсіруючых быў залічан і Карасёў.

2 кастрычніка разам з невялікай дэсантнай групай Іван Раманавіч пераправіўся на круты бераг сівога Дняпра. Усякае давялося яму пабачыць за гады вайны. Але такога, каб вада кіпела ад куль, мін, снарадаў і бомб, каб на маленькі пятачок зямлі, дзе замацаваліся чатыры дзесяткі смельчакоў, абрушыліся сілы цэлай варожай дывізіі... Не. Такога яшчэ не даводзілася бачыць. Страшэнны смерч агню і незмаўкальны грукат віселі над Дняпром дзень і ноч. Як патрэбна была пастаянная сувязь ударнай групы з асноўнымі сіламі дывізіі! А яна рвалася амаль штогадзінна.

– Сувязь! Сувязь!.. – крычаў паўаглухшаму Карасёву камандзір дэсантнай групы.

– Ёсць сувязь! – адказваў малодшы сержант і ўжо ў 27-ы раз здымаў з сябе гімнасцёрку, боты і кідаўся ў ваду, якая кіпела, але была халоднай.

Сувязь дзейнічала. Карасёў разам з байцамі адбіваў шалёныя контратакі гітлераўцаў...

Пазней былі новыя баі, новыя подзвігі. У канцы 1944 года Іван Раманавіч быў накіраван на вучобу ў ваеннае вучылішча сувязі, якое скончыў у 1946 годзе. Свой баявы вопыт афіцэр-герой перадаваў новаму папаўненню савецкіх салдат у часцях Чырванасцяжнай Беларускай ваеннай акругі.

Героя Савецкага Саюза, старшага лейтэнанта Івана Раманавіча Карасёва зараз няма сярод нас. На яго магіле паблізу роднай вёскі Вілейка ўдзячныя землякі ўзвялі помнік. Ля яго падножжа яркім полымем гарыць кветкі – даніна павагі герою і вечнай памяці.

**Я — "Арол", адказвай!.. // Магілёўская праўда. — 1970. — 15 красавіка. — С. 4.**